Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
29 КРАСАВІКА 2020 г. СЕРАДА № 82 (29196)


АДЛІК НА СЕКУНДЫ
4

РЫХТУЕМСЯ ДА ЦЯЖАРНАСЦІ
7


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КРУТОЙ, першы віцэ-прэм'ер:**

*«Ідзе штотыднёвая работа, каб пастарацца прыцягнуць рэсурсы, разгрузіць бюджэт, падтрымаць устойлівасць нашага дзяржаўнага доўгу і магчымасць яго рэфінансавання ў тых аб'ёмах, якія мы планавалі на пачатку гэтага года. Калі казаць пра перагаворы з МВФ, то ў рамках нашай квоты гэта прыкладна 900 мільёнаў долараў. Сусветны банк — гэта перагаворы прыкладна на 300 мільёнаў долараў, Еўрапейскі інвестыцыйны банк — таксама прыкладна 300 мільёнаў долараў. Сумарна каля 2-2,5 мільярда долараў мы зможам прыцягнуць ад знешніх крэдытораў. Гэта будзе вельмі добрая лічба».*

## КОРАТКА

- **Медыкі будуць атрымліваць з прафсаюзнага спецфонду ад Br600 да Br5 тысяч.**
- Дапамогу па беспрацоўі могуць павялічыць да памеру бюджэту пражытачнага мінімуму.
- **«Белавія» пачынае выконваць палёты ў Вену.**
- Адзіная платформа дыстанцыйнага навучання школьнікаў можа з'явіцца да канца года.
- **Белдзяржфілармонія ўвайшла ў топ-3 найлепшых сярод краін СНД.**
- Алімпіяду ў Токіа давядзецца адмяніць, калі да 2021 года не будзе пераможаны каранавірус.
- **У Беларусі часова дазволілі продаж лекаў з незарэгістраванымі цэнамі.**
- Інтэлектуальная анлайн-гульня «Дарогамі вайны» адбудзецца ў БДУ 30 красавіка. Спаборніцтва пройдзе на платформе Google. Старт будзе дадзены ў 14.30. Заяўкі на ўдзел прымаюцца да 12.30 30 красавіка.

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Трэба вярнуць гэты кавалак беларускай зямлі да жыцця»


Фота БелТА.

## На тэрыторыях, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, мяркуецца ствараць буйныя вытворчыя холдынгі пры ўмове атрымання «чыстай» прадукцыі

**У 34-ю гадавіну аварыі на Чарнобыльскай АЭС Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка традыцыйна наведаў тэрыторыі, якія пацярпелі ад наступстваў катастрофы. Сёлета гэта — Нараўлянскі раён, частка якога ўваходзіць у 30-кіламетровую зону адчужэння.**

Кіраўнік дзяржавы прыязджаў сюды і раней, быў на 25-ю гадавіну аварыі. Падчас той паездкі вучоныя і мясцовае кіраўніцтва прапанавалі беларускаму лідару задзейнічаць для развіцця турызму і сельскагаспадарчых работ частку выключаных з выкарыстання зямель. Размова ішла пра чатыры тысячы гектараў у Магілёўскай вобласці і 34 тысячы гектараў — у Гомельскай, на якіх, на думку вучоных, пры пэўных умовах ужо можна атрымліваць «чыстую» прадукцыю.

СТАР. 2

# ВОДАР ХАЛОДНАЙ ВЯСНЫ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Падрабязнасці

# Арэндныя канікулы і сацыяльная падтрымка

**У канцы мінулага тыдня Прэзідэнт падпісаў Указ 143 «Аб падтрымцы эканомікі», які быў прыняты па выніках нарады 23 красавіка аб першачарговых мерах па забеспячэнні ўстойлівай работы эканомікі і сацыяльнай сферы краіны ва ўмовах сусветнай эпідэміялагічнай сітуацыі.**

Паколькі гэты важны дакумент датычыцца многіх, сёння мы публікуем яго падрабязны пераказ.

### У сферы падаткаабкладання

Згодна з дакументам, дадзена адтэрміноўка і растэрміноўка выплаты падатковых крэдытаў, скарочаны тэрмін вяртання з бюджэту розніцы паміж сумай падатковых вылікаў і агульнай сумай ПДВ. Індывідуальным прадпрымальнікам даецца магчымасць пераходу на іншыя рэжымы падаткаабкладання і перараздліку адзінага падатку ў сувязі з часовым неажыццяўленнем імі дзейнасці.

Уводзяцца арэндныя канікулы, мараторый на павелічэнне базавай арэнднай велічыні і арэнднай платы. Акрамя таго, мясцовыя распарадчыя і выканаўчыя органы атрымліваюць права змяншаць маёмасныя падаткі. Юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам — уласнікам маёмасці рэкамендавана даваць арандатарам адтэрміноўку па арэнднай плаце, а таксама змяншаць яе памер з улікам аб'ёму іх выручкі.

Выбраны арганізацыяй парадак падатковага ўліку курсавых розніц можа быць зменены аднаразова на працягу 2020 года і будзе дзейнічаць на працягу ўсяго падатковага перыяду.

СТАР. 3